NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

2016

______________________________________________

(rajonas / miestas, mokykla)

_____ klasės mokinio (-ės) ______________________________

(vardas ir pavardė)

**2016 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**TEKSTO SUVOKIMAS IR LITERATŪROS ŽINIŲ TAIKYMAS**
**KALBOS ŽINIŲ TAIKYMAS**

Testas

**Pagrindinė sesija**

**6 мая 2016 г.** **Час – 1 гадзіна**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Праверце, ці няма пустых аркушаў ці іншых дэфектаў друку ў вашым тэксце. Калі заўважыце, паведамце настаўніку.
- Пісаць можаце і алоўкам, але канчатковы варыянт павінен быць напісаны ручкай сіняга колеру. Выкарыстоўваць карэктар забаронена.
- Будзе ацэньвацца і культура вашага пісьма: невыразна напісаныя, закрэсленыя адказы не будуць ацэнены (г.зн. за гэты адказ вы атрымаеце 0 балаў).
- На пытанні адказвайце коратка і зразумела. Вашы адказы павінны змясціцца ў адведзеных радках.

**VERTINIMAS**

| Užduotys | Maksimalus taškų skaičius | Surinktų taškų suma | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1 vertintojas | 2 vertintojas | 3 vertintojas |
| 1–3 | 2,5 | | | |
| 4–9 | 8,5 | | | |
| 10–15 | 7 | | | |
| 16–21 | 14 | | | |
| 22–25 | 8 | | | |
| Taškų suma | 40 | | | |
| Suapvalinta taškų suma | 40 | | | |
| | | | **Įvertinimas** | |

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2016

***Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні. (40 балаў)***

Павольна і вельмі ціха, але шырока расчыняюцца дзверы, і парог пераступае бацька. Які б ні быў у мяне занятак, я не магу працягваць яго і ўстаю гатовы слухаць. А ён, нібы баючыся забыцца на штосьці ці з чымсьці спазніцца, хуценька і старанна разгладжвае свае русыя багатыя вусы і, не адыходзячы ад парога, пытаецца: “А ці запісаў ты сабе такое слова?”. Надчэкваючы, каб усё было запісана, ён настройваўся яшчэ сказаць нешта – прыказку, кленіч, ласкавае і далікатнае прывітанне ці жорсткае і, як джала, пякучае, зламоўнае пажаданне.

Не два і не дваццаць разочкаў прыносіў мне, ужо настаўніку і сакратару рэдакцыі газеты, гэтыя найдаражэйшыя гасцінцы. І рабіў гэта толькі тады, калі не было сведкаў, а калі ў хаце хтосьці з сямейнікаў пачынаў казаць, што ўсё “піша і піша”, бацька рашуча, без ніякіх тлумачэнняў і разважанняў перапыняў размову. Я бачыў: мая праца здавалася бацьку незвычайнаю, мае клопаты – не зусім зразумелыя, мой занятак – далікатны і нейкі святы.

Калі я бачу партрэт Францішка Багушэвіча ці чую гэтае імя, побач устае вобраз бацькі. І наадварот. У абодвух былі амаль такія самыя вусы, абодва хударлявыя, энергічныя, няўрымслівыя і, здаецца, нястомныя. Абодва дарагія мне. Адзін – родны бацька, другі той, хто, як ніхто да яго, сказаў свету пра Беларусь і беларусаў, каго ў друку не раз называлі Бацькам. Абодва яны былі перакананы, што ведаць родную мову трэба дзеля таго, каб не “ўмёрці”.

(*Паводле Ф. Янкоўскага*)

| | Балы 1 | Балы 2 |
|---|---|---|
| **1.** Пра каго расказваецца ў тэксце?<br>____________________<br>____________________<br>*(0,5 бала)* | __ | __ |
| **2.** Якім пачуццём прасякнуты гэты ўрывак?<br>____________________<br>____________________<br>*(1 бал)* | __ | __ |
| **3.** Выпішыце сказ, які сведчыць пра павагу аўтара тэксту да бацькі.<br>____________________<br>____________________<br>*(1 бал)* | __ | __ |

| | | |
|---|---|---|
| Сума балаў за 1–3 заданні *(макс. 2,5 бала)* | | |

*Балы*
*1 2*

**4.** Назавіце самую яскравую дэталь партрэта галоўнага героя.

______________________________

______________________________

*(0,5 бала)* __ __

**5.** Выпішыце сказ, які паказвае адносіны бацькі да занятку сына.

______________________________

______________________________

______________________________

*(1 бал)* __ __

**6.** Чаму бацька адчыняе дзверы “павольна і вельмі ціха” (1-ы сказ)?

______________________________

______________________________

______________________________

*(2 балы)* __ __

**7.** Што Ф. Янкоўскі называе “найдаражэйшымі гасцінцамі”?

______________________________

______________________________

______________________________

*(2 балы)* __ __

**8.** Дакажыце (*словамі з тэксту*), што бацька неаднаразова ўжо дапамагаў сыну, прыносячы “найдаражэйшыя падарункі”?

______________________________

______________________________

______________________________

*(1 бал)* __ __

**9.** Чаму бацька прыносіў “гасцінцы”, “толькі тады, калі не было сведкаў”?

______________________________

______________________________

______________________________

*(2 балы)* __ __

| | | |
|---|---|---|
| Сума балаў за 4–9 заданні *(макс. 8,5 балаў)* | | |

*Балы*
*1 2*

**10.** З якой галіной навукі звязана дзейнасць аўтара тэксту? *Правільны адказ абвядзіце.*

А Гісторыя

Б Філалогія

В Прыродазнаўства

Г Этнаграфія

*(1 бал)* __ __

**11.** Да каго падобны бацька знешне? У чым гэта падабенства? *Адкажыце словамі тэксту.*

___

___

___

*(1 бал)* __ __

**12.** Выпішыце сказ, які сведчыць, што Ф. Багушэвіч і бацька – галоўныя людзі ў жыцці аўтара.

___

*(1 бал)* __ __

**13.** Чым тлумачыць Ф. Янкоўскі такія свае адносіны да Ф. Багушэвіча? *Адкажыце словамі тэксту.*

___

___

___

*(1 бал)* __ __

**14.** Выпішыце сказ, які паказвае адносіны бацькі Ф. Янкоўскага да роднай мовы.

___

___

*(1 бал)* __ __

**15.** Чаму ў апошнім сказе слова *Бацька* напісана з вялікай літары?

___

___

___

*(2 балы)* __ __

| Сума балаў за 10–15 заданні *(макс. 7 балаў)* | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1 2*

**16.** Выпішыце па аднаму прыкладу:

эпітэта: ______________________________

параўнання: ______________________________

*(2 балы)*

**17.** Прывядзіце прыклад сваёй любімай беларускай прыказкі ці прымаўкі.

______________________________

*(2 балы)*

**18.** У кожным радку дапішыце прозвішча пісьменніка (*Ф. Аляхновіч, Ф. Багушэвіч, Я. Купала*), якое адпавядае прыведзенаму азначэнню:

Бацька новай беларускай літаратуры – ______________________________

Бацька беларускай нацыі – ______________________________

Бацька беларускай драматургіі XX ст. – ______________________________

*(3 балы)*

**19.** Вызначце стыль і тып тэксту

Стыль: ______________________________

Тып: ______________________________

*(2 балы)*

**20.** Выпішыце з тэксту адзін складаназлучаны сказ.

______________________________

______________________________

______________________________

*(1 бал)*

**21.** Пазначце колькасць гукаў у словах:

працягваць – ____________

устаю – ____________

спазніцца – ____________

джала – ____________

*(4 балы)*

| Сума балаў за 16–21 заданні *(макс. 14 балаў)* | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1* *2*

**22.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы:

а) *шырока* расчыняюцца дзверы – ______

б) *баючыся* забыцца на штосьці – ______

в) сказаць яшчэ *нешта* – ______

г) не *два* і не *дваццаць* разочкаў – ______

*(2 балы)* __ __

**23.** З першага абзаца выпішыце адну пару антонімаў.

______

______

*(1 бал)* __ __

**24.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:

1) расчыняюцца дзверы;
2) сказаць нешта;
3) чую імя;
4) я бачыў;
5) дарагія мне.

*(2 балы)* __ __

**25.** Запішыце форму давальнага склону адзіночнага ліку наступных слоў:

прыказка – ______

джала – ______

газета – ______

*(3 балы)* __ __

| Сума балаў за 22–25 заданні *(макс. 8 балаў)* | | |
|---|---|---|

# Чарнавік